*Горкая праўда, чыстая праўда, голая праўда, сьвятая праўда.*

XX стагодзьдзе пакіне па сабе *праўду* пра Чарнобыль і Курапаты, пра Беларускую Народную Рэспубліку і Беларускую Краёвую Абарону, *праўду* пра камунізм і *праўду* пра РБ.

Паэты ведаюць, што рыфма адкрывае таямніцу кожнага слова... На слова „*праўда*" рыфмы няма.

# Праца

***Міхась Скобла***

*Працавіты, выпрацоўка, працоўны, беспрацоўны, супрацоўнік.* А мудры Насовіч падае яшчэ з паўтузіна словаў, ад якіх нашыя вушы ўжо пасьпелі адвыкнуць: *працаваньне, працаваны, працавітка* і нават *працавітачка* — гэтак называлі маладзіцу, у якой работа спорылася ў руках і якая за бяседным сталом высьпеўвала:

> Гарэлачкі, акавітачкі,
> Дзеля мяне, *працавітачкі*...

Завіхаліся людзі на ўласнай зямлі, даглядалі сваю гаспадарку, і адносіны да *працы* былі паважныя, самавітыя. *Працуем — смак чуем, праца з балота робіць залота, праца гадуе — а лянота марнуе...*

Ды зьявіліся калгасы, і час, праведзены ў полі ці на таку, стаў называцца „*працадзень*". Паводле колькасьці *працадняў* дзяржава вызначала, каго павесіць на дошку гонару, каго ўзнагародзіць мэдалём „*За працоўную доблесьць*", а каго і зрабіць нават *Героем сацыялістычнай працы.*

Слова „*праца*" ўваходзіла ў набор абавязковых ідэалягемаў, якімі камуністычная партыя тлуміла людзям галовы. Любы кіраўнік *працоўнага* калектыву мусіў мець чырвоную кніжачку за пазухай і ведаць, што і як гаварыць у мікрафон ці перад камэрай. Як той прараб зь верша раньняга Ўладзімера Някляева:

> Давай пішы з абзаца, ці як у вас там звычна:
> Навекі слава *працы*, БССР і клічнік!

Але ў адным выпадку звычайнае слова „*праца*" ўсё ж заслугоўвае на вялікую літару. Гэткі назоў мела зэльвенская раённая газэта, дзе зрэдку зьяўляліся вершы Ларысы Геніюш.

Яшчэ пры жыцьці аўтаркі.

# Працадзень

***Уладзімер Арлоў***

*Працадзень* — слова, якое прысутнічае толькі ў мовах народаў былога Савецкага Саюзу і якое архіскладана перакласьці на любую мову гэтак званага далёкага замежжа.

Тлумачальны слоўнік беларускае мовы паведамляе, што *працадзень* — гэта адзінка ўліку працы ў калгасах, якая вызначала долю калгасьнікаў у даходах.